УДК 159.964.2:75.01+76.01

# УВАСАБЛЕННЕ ЭТНАКУЛЬТУРНЫХ ПРАСТОРАВЫХ АРХЕТЫПАЎ У МАСТАЦКАЙ СПАДЧЫНЕ ЯЗЭПА ДРАЗДОВІЧА

***Ульяна Жылко***
*Гродна, Беларусь*

Артыкул прысвечаны выяўленню і інтэрпрэтацыі прасторавых этнакультурных архетыпаў у творчай спадчыне Язэпа Драздовіча. Аўтар раскрывае сакральны і аксіялагічных змест прасторавых локусаў (дарога, рака, лес, возера, гара, дом), вызначае іх функцыянальнае месца ў пабудове карціны свету прадстаўніка этнічнай супольнасці.

***Ключавыя словы: этнакультурныя архетыпы, калектыўнае бессвядомае, Карл Юнг, прасторавыя архетыпы, архетыпічныя вобразы, Язэп Драздовіч***

Апошнім чынам усё большую папулярнасць набываюць тэорыі аб генетычнай сувязі народа з тэрыторыяй, на якой ён жыве. Дадзеная сувязь зафіксавана на глыбінным узроўні псіхікі, які быў вызначаны К. Юнгам як “калектыўнае бессвядомае”, што складаецца з архетыпаў. Архетып (правобраз, узор, першакрыніца) – носьбіт чалавечага вопыту, першасны вобраз, універсальная мадэль канцэнтрацыі вопыту, назапашанага ўсімі папярэднімі пакаленнямі [7, с. 190]. Акрамя ўніверсальных, агульначалавечых архетыпаў, тэрытарыяльнае і культурнае адзінства супольнасці дазваляе вылучыць этнакультурныя архетыпы, індывідуальныя для пэўнай культуры.

Праблема этнаспецыфічных кампанентаў культуры займае адно з вядучых месцаў у галіне культуралагічных ведаў. Этнічная культура беларускага народа выступае акумулятарам шматвекавога духоўнага вопыту, выразнікам самабытнасці і ўнікальнасці этнасу, а творчае перайманне культурнага досведу з’яўляецца неабходнай умовай для актыўнага развіцця нацыянальнай культуры ў сучасным глабалізацыйным, асабліва для нацыі, што знаходзіцца ў пошуку вытокаў і канцэптаў сваёй нацыянальнай самаідэнтыфікацыі [3, с. 289].

Этнічныя архетыпы (этнакультурныя архетыпы) ўяўляюць сабой канстанты нацыянальнай духоўнасці, якія выказваюць і замацоўваюць асноўныя ўласцівасці этнасу як культурнай цэласнасці. У кожнай нацыянальнай культуры дамінуюць свае этнакультурныя архетыпы, істотным чынам яны вызначаюць асаблівасці светапогляду, характару, мастацкай творчасці народа. У этнакультурных архетыпах у канцэнтраваным выглядзе прадстаўлены калектыўны вопыт народа; уласна, яны ёсць вынікператварэння этнічнай гісторыі ў базавыя мадэлі этнічнага культурнага вопыту. Актуалізацыя этнакультурнага архетыпа ўключае гэты вопыт у новы гістарычны кантэкст [6, с. 12].

ПолесГУ

Так пад этнакультурнымі прасторавымі архетыпамі мы будзем разумець адметныя прасторавыя вобразы, якія несвядома перадаюцца з пакалення ў пакаленне, пранізваюць ўсю мастацкую культуру ад міфалагічных вытокаў да сучаснасці і ўтвараюць сталы фонд вобразаў і сюжэтаў.

Галіна мастацкай культуры выступае выдатнай крыніцай выяўлення этнаспецыфічных кампанентаў, транслятарам адметнасцей і этнакультурных дамінант светаўспрымання народа ў часе і прасторы. Таямнічая асоба Язэпа Драздовіча – самабытнага генія, які апярэджваў свой час, у гэтым дачыненні падаецца надзвычай знакавай, паколькі ў сваёй творчасці мастаку ўдалося адлюстраваць глыбінны архетыпічны пласт культуры народа, увасоблены ў выглядзе сукупнасці прасторавых локусаў, якія маюць сімвалічны змест і адлюстроўваюць карціну свету прадстаўніка этнічнай супольнасці. Да таго ж у гэтым годзе адзначаецца 130-годдзе творцы.

Адметнасцю этнічнага светапогляду, якая абумоўлівае будову этнапрасторы, з'яўляецца семіятызацыя гэтай прасторы: любы прасторавы локус выступае носьбітам дадатковай канатацыі і займае сваё месца ў карціне свету. Звярнем увагу на той факт, што прасторавыя архетыпы звычайна маюць тэндэнцыю выступаць у культуры парамі, у выглядзе бінарных апазіцый, антынамічных пар: космас/хаос, якая выступае асновай для іншых прасторавых апазіцый, такіх як: дом/поле (бяспечная прастора/небяспечная прастора), дом/дарога (закрытая прастора/адкрытая прастора), дом/руіны (свая прастора/разбураная прастора) і інш. Варта заўважыць, што архетыпічную семантыку набываюць таксама і некаторыя параметры прасторы, напрыклад бакі свету або прасторавыя восі: вертыкальная і гарызантальная. Дадзенае становішча пацверджанаецца меркаваннем многіх даследчыкаў аб устойлівай архаічнай прасторавай мадэлі, у якую ўваходзяць бінарныя апазіцыі (сваё/чужое, верх/ніз, поўдзень/поўнач і інш.), сакральны цэнтр і прафанная прастора, а таксама прадметы і з'явы, архетыпічныя значэнні каторых звязаны са старажытнай культурнай традыцыяй і абумоўлены ў міфалагічнай сістэме светапогляду.

Рэпрэзентатыўны аналіз творчасці Я. Драздовіча дазваляе выявіць этнапрасторавыя архетыпы ў іх сімвалічна-вобразным пераасэнсаванні і рэканструяваць на іх аснове цэласную мадэль беларускага космасу. У якасці матэрыяла для выяўлення этнапрасторавых архетыпаў мы спынім увагу на графічных і акварэльных замалёўках Я.Драздовіча, а таксама на маляваных дыванах.

Цэнтрам беларускага космасу, адлюстраванага Я.Драздовічам, з'яўляецца дом, гаспадарская сядзіба. Гэта выразна прасочваецца ў такіх творах, як "Ляскова", "Родныя мясціны. Засценак Пунькі", "Сядзіба на ўскрайку Галубіцкай пушчы", "Засценак. Зіма. Вясковы краявід". Архетып дома выступае ўтваральным ядром ідэальнай самадастатковай этнапрасторы. Дом – гэта артыкуляваная ў адчувальных матэрыялах думка з нагоды самабудовы чалавека, гэта яго цэнтр светастварэння [4, с. 320]. Хата, знаходзячыся на зямлі і ў той жа час узвышаючыся над ёй, паядноўвае зямлю і неба, з'яўляецца для свайго гаспадара своеасаблівым цэнтрам падзелу Сусвету, сімвалізуе цэнтр жыццёвай прасторы, кропку адліку ўсіх астатніх прасторавых каардынат, вакол якой яднаюцца чатыры бакі свету, тым самым утвараючы замкнёную прастору.

Вобраз дома ў мастацкай культуры мае архетыпічныя семантыку, калі рэалізуе значэнне закрытага ўнутранай прасторы, якая забяспечвае супакой, бяспеку і надзейную абарону, значэнне засяроджаньня універсальных жыццёвых каштоўнасцяў – такіх, як шчасце, дабрабыт і згода ў сям'і, матэрыяльны дастатак. У творах Я.Драздовіча ўпарадкаванасць прасторы вакол сэнсавай дамінанты дома выражаецца ў жыццясцвярджальных сімвалах прыроднай прадуктыўнасці, захаванага і адроджанага жыцця: агарод, пчаліныя вуллі, гумно, што захоўвае сабраную з поля збажыну, – Я.Драздовіч раскрывае харaство зямнога "тут-быцця", прыгажосць і ўпарадкаванасць малой радзімы.

Дом таксама звязвае мінулае з будучыняй і з'яўляецца месцам яднання пакаленняў, якое і надае яму не толькі фізічную, радавую, але і духоўную, метафізічную каштоўнасць.

Сінанімічным увасабленнем архетыпу дома ў Я.Драздовіча выступае вобраз замка-палаца (маляваныя дываны “Замак над возерам”, “Месячная ноч”, “Краявід з замкам”, “Краявід з балюстрадай”, “Начны краявід”, “Краявід з чоўнам”, карціны “Краявід з цягнікам”, “Поўня над замкам”. Замак успрымаецца як сімвал абароненага гаспадарства, умацаванага сакральнага цэнтра, сімвал велічы і магутнасці. Архетып дома, увасоблены ў вобразе замка-палаца, падзяляе сімвалічнае значэнне закрытасці, абароны, месца фізічнага і духоўнага прытулку, духоўнай моцы. Таямнічыя замкі на дыванах Я.Драздовіча можна інтэрпрэтаваць таксама як частку таямнічага іншасвета – той прасторава-часавай сістэмы, якая супрацьпастаўлена рэальнасці. Вобраз палаца ў мастака часта суправаджаецца памежнымі локусамі: замак на гары, замак над возерам, амаль у паднябессі, у святле поўні.

Архетыпічнай семантыкай валодае такі элемент этнапрасторы, як узгорак, гара, выспа – верхнія каардынаты прасторавай вертыкалі. Выспа у беларускай міфапаэтычнай карціне свету азначае паўсталую з хаоса, упарадкаваную прастору – сакральны участак сушы, абкружаны вадой, які трывала суадносіцца з цэнтрам свету ў значэнні першаснай, ідэальнай прасторы. Гара па сутнасці, з’яўляецца месцам найбольш набліжаным да боскага свету [2, с. 114]. У Я.Драздовіча дадзены этнапрасторавы архетып, акрамя згаданых дываноў, адлюстраваны ў шматлікіх творах: “Гара Гараватка”, “Далёкая краіна”, “Гарадзец на Мнюце”, “Гара Гедзіміна”, “Гара Варганіха”, “Вёска Гараватка”. Руіны старой крэпасці, размешчанай на ўзвышшы, адлюстраваны на графічным абразку “Вогнішча”. Тут мастак відавочна паяднаў два згаданыя вышэй этнапрасторавыя архетыпы ў сімвалічным увасабленні канцэпта “разбуранага дома-гаспадарства”, “раскіданага гнязда”, страты былой велічы і дзяржаўнай самастойнасці, адлюстраваных ў прасторавых каардынатах вертыкалі, а менавіта – верху.

Варта адзначыць, што гара фігуруе і ў вербальнай творчасці Я. Драздовіча, у прыватнасці, у гістарычным рамане “Гарадольская пушча”, дзе ён маляўніча апісаў усе прасторавыя локусы беларускай карціны свету. *“Узыдзі на гару Чалагор’е, што ля пушчы, ды ўгледзься ў гэтае сіняе мора лясоў, што як быццам паўсвета сабой агарнулі. Лес ды лес, лес ды лес, а за ім яшчэ без пярэрвы шыза-сінія стугі лясоў, быццам нейкае безбярэжнае чароўнае мора. Глянь управа – бесканечная даль. Якая тут шыр прастору ў шызым тумане разлогаў-роўнядзі, якой і канца не відаць. Гэта галікі – наш мокры стэп: пушчанскія лугі, сенажаці. Тут Бяроза-рака бярэ першыя воды свае... Глянь улева ўдаль па ўзбярэжжы пушчы, дзе, як быццам курган, велікан-валатоўка, узнялася над лесам гара Гараватка. Тут бары ды бары, бары ды бары, нібы дзіўны дыван разаслаўся, сатканы з вершалін хваін зелянковага цёмнага бору. Глянь насупраць на разлогі ляснога прастору, дзе, як быццам у казцы нябачанага горада, зубчастыя сцены лясоў, сцяна за сцяной аж да самага небасхілу. Гэта стругі недаступнага першабытнага лесу, самабытны звярыны прыпынак мядзведзя, лася, дзікіх коз, лісіц і куніцы...”* [1].

У творы “Гарадзец на Мнюце” у кампазіцыйным цэнтры знаходзіцца дрэва на гары. Архетыпічны вобраз дрэва ў сістэме каардынат беларускага этнасу займае знакавае, цэнтральнае становішча. Чалавек уяўляў сабе свет менавіта ў выглядзе дрэва: вобраз Сусветнага Дрэва з’яўляецца фундаментальным у міфалагічнай свядомасці. Таму ў творах мастака часта сустракаецца адзінокае дрэва, старая сасна на кургнішчы.

Яшчэ адным з цэнтральных вобразаў-архетыпаў у творчасці Я. Драздовіча, які суадносіцца з каардынатамі свету і выяўляе розныя аспекты беларускай рэчаіснасці, з’яўляецца возера. Архетыпічны змест возера найперш звязаны з вадой як адной з касмаганічных стыхій. Возера выступае ў якасці важнага складніка светабудовы, значнага элемента беларускага космасу, да якога прымыкаюць астатнія ландшафтна-тапаграфічныя аб’екты, напоўненыя сімвалічным зместам: гара, лес, вёска. Для беларускай традыцыі характэрна пазітыўнае напаўненне канатацыі сімвала возера. Нездарма азёрнасць Беларусі выступае ў якасці адной з этнічных прыкмет. Пацвярджэннем факту, што ў мастака возера маркіруе прастору з’яўляюцца работы “Возера Гародня ў зазімак”, “Дзісеншчына. Гінь-возера”, “Замак, тэраса, ветразь”, “Замак над возерам”: дзе водная прастора часта акружае

ПолесГУ

выспу як сакральны цэнтр упарадкаванага свету, выступае ў якасці памежнага прасторавага локуса.

Сярод прасторавых каардынат, адлюстраваных мастаком у творах, трапляецца лясное возера, што таксама падаецца ўвасабленнем архетыпічных матываў. Сімвалічнае прачытанне лесу як элемента прасторы можна акрэсліць яго асноўнай функцыяй: адмежаванне ад знешняга свету, падзел паміж двума светамі. Лес выступае элементам ландшафтнага коду традыцыйнай мадэлі свету беларусаў, які разам з іншымі элементамі (полем, стэпам, рэкамі, азёрамі, гарамі, камянямі) на свой лад структурырые прастору "гэтага" свету, будучы семантычна вельмі адрознымі [5, с. 284]. Лес мае архетыпічную семантыку, паколькі рэалізуе значэнне месца, якое прадстаўляе небяспеку, пагрозу человеку, спараджае ў яго пачуццё страху, з'яўляецца месцам (ці прычынай) гібелі чалавека. Архетыпічны змест дадзенага элемента этнапрасторы, на першы погляд, палягае ў межах апазіцыі "дом-лес", "свой-чужы", рэпрэзентуючы адмоўны полюс – стыхію, адмоўную чалавеку. Атрымліваецца, што дом і лес – дзве процілеглыя прасторы. Архетыпічныя рысы дома: утульнасць, бяспека, шчасце, багацце, гасціннасць; лесу – трывога, небяспека, месцазнаходжанне таямнічых сіл.

Аднак для беларускай культуры, як слушна заўважае этнакультуролаг С. Санько, характэрны ўяўленні пра лес як пра добрую ці, прынамсі, не безварункава варожую для чалавека прастору [5, с. 284]. У творах Я. Драздовіча дадзены тэзіс атрымлівае мастацкае пацверджанне: пры ўсіх прыкметах прасторавай апазіцыі знешні/унутраны, небяспечны/бяспечны, на большасці карцін і графічных малюнкаў мастака лес, пушча, гушчар выступаюць гарманічным складнікам упарадкаванай прасторы ідэальнага свету: лес падаецца блізкім і суаднесеным хутчэй са сферай "свайго" свет, чым "чужога" ("Гарадольская пушча", "Узлессе", альбом "Галубіцкая пушча").

Сінтэзаванае адзінства архетыпічных вобразаў лесу як статычнай замкнёнасці і руху адлюстравана ў графічным творы "Вецер", напоўненым дынамікай і экспрэсіяй, ажыўленнем звыклай прасторавай статыкі краявіду. Рух пашырае межы, лучыць далёкае і блізкае, мінулае і будучыню. Краявід становіцца часткай шырэйшага свету праз адлюстраванне падхопленых буйным ветрам кустоў і крыху гайдаючыхся таполяў. І на заднім плане бялее невялікі двор, што гарманічна лучыць у этнапрасторы прыродны, стыхійны, "антыкультурны" свет з антрапалагічным, "культурным".

Яшчэ адным з дамінуючых архетыпаў, які семантычна палягае ў антыноміі закрытая прастора / адкрытая прастора выступае дарога, шлях, гасцінец. Увогуле, дарога – цэнтральны архетып беларускай этнакультуры. Калі дом – статычны свет у спакоі, космас, адмежаваны ад хаосу, прасторавая форма спакою засвоенага існавання "у сабе", у сваім свеце, то шлях – гэта прасторавая форма адкрыцця чужога – гэта рух "ў бок", "выхад з сябе". У вобразе шляху прастора збліжаецца з лінейным часам з акцэнтам на будучыні. У вобразе хаты, наадварот, прастора як бы "мірыць" розныя аспекты часу.

Прынцыпова значнай для сімвалічнай інтэрпрэтацыі этнапрасторавага архетыпа дарогі з'яўляецца яе непарыўная суаднесенасць з ідэяй руху, які ў сваю чаргу выступае эквівалентам жыцця [3, с. 291]. Невыпадкова, што менавіта дарога і ёсць сімвалічным азначэннем чалавечага жыцця. Жыццёвы шлях Я.Драздовіча, вечнага вандроўніка, па сутнасці выступае сімвалічным увасабленнем дадзенага архетыпа. У творчасці мастака дарога найперш выступае ў якасці прасторавага элемента, які злучае, адасоблены, ізаляваны свет сядзібы шляхціца са знешнім светам, выступае своеасаблівым камунікатыўным каналам. Дарога ў беларускай этнакультуры ўвасабляе сувязь з іншасветам і светам памерлых. Як медыятары паміж "гэтым" і "тым" светам выступаюць старцы, "падарожныя" людзі, вандроўнікі. Сімвалічным увасабленнем дадзенага аспекта народнага светапогляду з'яўляецца жыццёвы і творчы шлях самога Я. Драздовіча – вечнага вандроўніка, шукальніка вышэйшых сэнсаў, мастака, які паяднаў зямлю і космас.

Дарога з'яўляецца бадай самым парадаксальным элементам беларускай этнапрасторы, адзіным элементам культурнага ландшафту, які з'яўляецца візуальна невымерным (яе нельга акінуць вокам. Сягаючы далягляду (неба), дарога маніфестуе сваю



ПолесГУ

сувязь з тагасветам, іншасветам, схаваным, невядомым светам. Як бачым, у Я.Драздовіча дарога, шлях, гасцінец – дамінантны элемент многіх твораў. Яе можна інтэрпрэтаваць як камунікацыйную нітку, што звязвае чалавека са "сваім" светам і не дае збочыць у патэнцыйна варожую, "прафанную" зону. Дом захоўвае ўстойлівасць быцця, таму жыццё там ідзе па коле цыклічнага часу. Дарога месціць у сабе разуменне руху не толькі як перамяшчэння з аднаго пункта ў іншы, не толькі як з'явы фізічнай, але і як з'явы духоўна-маральнай: дарога як сродак духоўнага фарміравання, самапазнання, здабывання мудрасці, спасціжэння сябе ў свеце і свету ў сабе. У дадзеным дачыненні выразна прыгадваюцца творы  Я. Драздовіча "Францыск Скарына. У свет па навуку", "Дарога на Германавічы", "Гасцінец".

З архетыпічнай ідэяй руху і шляху звязаны яшчэ адзін элемент ландшафтнага коду беларускай этнапрасторы – рака, якая часта сустракаецца ў творах Я. Драздовіча. Рака выступае ў якасці стрыжня Сусвету, канала, камунікацыйнага элемента, які злучае два светы: вядомы і невядомы, засвоены і прафанны. Я. Драздовіч удала ўпісвае ў сыхійны прасторавы элемент ракі прыкметы чалавека, тым самым падкрэслівае іх адзінства і ўзаемадзеянне. У акварэльным малюнку "Рэчка Дзісёнка вясной" беларускі Сусвет гарманічна складзены з асноўных локусаў: бору, курганішча і імклівай плыні ракі, па якой натуральна рухаецца плыт з раскладзеным на ім вогнішчам.

Варта падкрэсліць, што ў большасці твораў Я.Драздовіча назіраецца выразная дамінацыя імкнення ўверх, у вышэйшую кропку каардынатнай вертыкалі, што ўвасобілася ў вобразах дарогі, ракі, як прыроднастораных элементаў, з'яўленне якіх не прадугледжвала стваральнай працэдуры будаўніцтва ці нейкіх адмысловых чалавечых высілкаў – яны натуральным чынам імкнуцца ўдалячынь, вышэй за звыклы зямны ўзровень.  Імкненне ў вышэйшую кропку вертыкальнай прасторавай восі назіраецца і ў архетыпічных вобразах сходаў, лесвіцы, прыступак, часта разбураных, але выразна скіраваных у верх кампазіцыі. Сходы прысутнічаюць у знакамітай рабоце "Прарок", "які нібыта злучае чалавечы свет і боскі, матэрыяльнае і духоўнае. Праз  векавечныя муры ён пралажыў шлях да святла" [6, с. 28]. І шлях гэты пралягае па сходах і дарозе ў самыя нябёсы, да Бога-творцы.

Я.Драздовіч выдатна разумеў неабходнасць гарманічнага адзінства архетыпічна процілеглых локусаў этнапрасторы ў сваіх творах: абсалютная адмова ад аднаго з прасторавых архетыпаў вядзе да парушэння тапалагічнай раўнавагі чалавечага існавання. Як поўнае адмаўленне адкрытасці свету вядзе да свайго роду зруйнаванага быцця, так і абсалютная адхіленне інтымнага, схаванага аспекту быцця вядзе да жыццёвай неўтаймаванасці, вечнай немагчымасці прыстаць да берага. Таму ў такіх творах, як "Дарога на Германавічы", "Вёска Лаўрынаўка на Дзісненшчыне", "Вёска Гараватка", "Гасцінец докшыцкага тракту" дарога вядзе або да хаты, або каля хаты. Беларускі космас, адлюстраваны ў творах Я.Драздовіча, і адкрываецца, і зачыняецца адначасова. Свет можа агароджвацца і абжывацца, захоўваючы святасць той тэрыторыі, дзе цябе заўсёды чакаюць. Але свет разам з тым і адкрываецца, калі чалавек адпраўляецца на пошукі сэнсу менавіта свайго жыцця; калі ён хоча стаць самім сабой, а не проста прадстаўніком роду, сям'і. гэта канструктыўны момант адрыву "я" ад "мы", паколькі ў Я.Драздовіча ён прадугледжвае вяртанне.

Гасцінец у Я.Драздовіча паядноўвае мінулае і будучыню: доказам таму з'яўляецца прысутнасць на графічных абразках і карцінах уздоўж дарогі яшчэ аднаго архетыпічнага этнапрасторавага элемента – каменя і кургана. Напрыклад, у творы "Вітаўтавы масты. Стаянка князя Вітаўта" адлюстравана звычайная лясная дарога праз рэдкі бор, зводдаль якой відаць курганы як памятка мінулага. У невялікім аркушы "Над Дзісёнкай" мастак адлюстроўвае на ўскрайку глыбокага яра на пагорку прысадзісты каменны крыж, які ставілі на старадаўніх пахаваннях, валатоўках. Каменны крыж выступае своеасаблівым сімвалам ў беларускай этнакультуры і адлюстроўвае архетыпічны змест ў маркіраванні прасторы – сімвалізуе вечнасць, што палягае ў яго фізічных здольнасцях (важкасць, цвердасць). Каменныя надмагільныя крыжы як пазнаку памяці можна ўбачыць як у

пейзажных замалёўках, так і ў містычных творах Я.Драздовіча – “Прывідзе”, “Пагоні Ярылы”, дзе на старым цяжкім надмагільным камені-крыжы накрэслены словы “Vita. AIbarusia. Libertas” – “Жыццё. Беларусь. Свабода”, якія можна вылучыць як дамінуючыя, вызначальныя аксіялагемы каштоўнаснай іерархіі беларускага светапогляду.

Ні для каго не сакрэт, што Язэп Драздовіч вядомы ў гісторыі беларускай культуры як глыбокі творца, што сваімі экзістэнцыяльнымі пошукамі сягаў за межы пачуццёвага досведу у касмічныя прасторы. Адлюстраваны мастаком на акварэльных і графічных замалеўках беларускі сусвет – космас, як нейкая гарманічная ўпарадкаванасць, што супрацьстаіць хаосу сусветнай энтрапіі, выдатна экстрапалюецца ў касмавізіях мастака: маркеры беларускай этнапрасторы ўвасабляюцца і на відарысах Месяца, Сатурна, Венеры. Матывы зямнога беларускага ландшафту, пераўтвораныя ва ўяўленні мастака, пераважаюць у яго касмічных творах.

Такім чынам, праведзеная спроба выяўлення архетыпічных матываў у этнапрасторы, адлюстраванай у творчай спадчыне Я.Драздовіча, дазваляе зрабіць выснову аб абумоўленасці семантыкі прасторавых локусаў у міфалагічнай сістэме светапогляду. Архетыпічныя вобразы дома, гары, дарогі, ракі, возера, леса, каменя выступаюць складнікамі гарманічнай мадэлі свету беларускай этнічнай супольнасці, якія ўзаемаабумоўліваюць, ураўнаважваюць прастору, адлюстроўваюць аксіялагічны змест светапогляду беларускага народа.


1. Драздовіч, Я. Гарадольская пушча / Я. Драздовіч. – Режым доступу: https://drazdovich.by/gallery/3 . – Дата доступу: 28.09.2018.
2. Дучыц, Л., Лобач У. Гара / Л.Дучыц, У.Лобач // Беларуская міфалогія: энцыклапедычны слоўнік Мн.: “Беларусь”, 2004. – С. 114.
3. Жылко, У.А. Увасабленне этнапрасторы ў творчай спадчыне Я. Баршчэўскага / У. А. Жылко // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе: сб. науч. ст. / ГрГУ им. Я. Купалы; редкол.: М.А. Можейко (гл. ред.) [и др.]. – Гродно: ГрГУ, 2012. – С. 289 – 292.
4. Морозов, И. В. Основы культурологии: архетипы культуры / И. В. Морозов. – Мн.: ТетраСистемс, 2001. – 608 с.
5. Санько, С. Лес / С.Санько // Беларуская міфалогія: энцыклапедычны слоўнік Мн.: “Беларусь”, 2004. – С. 283 – 285
6. Сухоцкая, Т.Ф. Архетыпы культуры. Вучэбна-метадычны комплекс / Т.Ф. Сухоцкая. – Мн.: БДУКМ, 2017. – 114 с.
7. Юнг, К. Г. Архетип и символ / К. Г. Юнг. – М. : Renaissans, 1993. – 286 с.


Полесгу